УДК 7.046.1.

# КАНЦЭПТУАЛІЗАЦЫЯ ЎЯЎЛЕННЯЎ АПАКАЛІПСІСУ Ў СКАНДЫНАЎСКІМ НЭАЯЗЫЧНІЦТВЕ

**Барадзін Юрый Сігізмундавіч**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (г. Мінск, Беларусь)

*Большасць рэлігій свету згадвае надыходзячы ў будучыні канец свету. З індаеўрапейскіх і язычніцкіх міфалогій германа-скандынаўская канцэптуалізуе ўяўленне пра апакаліпсіс. Падобны канец свету як «Дзень Страшнага Суду» у хрысціянскай Бібліі, назіраецца ў скандынаўскім нэаязычніцтве, і называецца «Рагнарок» (змярканне і гібель багоў).*

У германа-скандынаўскай міфалогіі дню Рагнарок папярэднічаюць парушэнне радавых нормаў, крывавыя сваркі паміж сваякамі, сутычкі паміж багамі. Старажытна-ісландскія помнікі Сноры Стурлусана «Малодшая Эда» і «Старэйшая Эда» Сэмунда Мудрага прарочаць непазбежнасць канца свету. Скандынаўскі апакаліпсіс прадказала мёртвая празорліўка – Вельва, што часова паўстала з магілы, каб сказаць багам свае прароцтва [4, с. 30].

Скандынаўскі космас асуджаны на пагібель з самага пачатку свайго стварэння з пасечаных частак цела волата Іміра, забітага Ўсебацькам Одзінам і яго



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

братамі – Ві і Велі [2, с. 18]. Тыя волаты, што засталіся ў жывых, прагнуць помсты за Іміра і іншых забітых волатаў. І ў дзень фінальнай, апошняй бітвы яны канчаткова сутыкнуцца з скандынаўскімі багамі.

Рэлігія вікінгаў падкрэслівае непазбежнасць лёсу, што адлюстроўваюць няўдалыя спробы Одзіна і яго жонкі – багіні Фрыг – уратаваць іх сына – бога вясны – Бальдра ад наканавай пагібелі [3, с. 21]. Нягледзячы на іх высілкі і намаганні, Бальдр усё жа гіне ад амелы, выпушчанай выпадкова з рукі яго брата – сляпога Хёда, затым з-за хітрасці і падступства бога агню і падману – Локі, які падстроіў забойства. Смерць і пагібель Бальдра стала пачаткам для Рагнарок, які не ўдалося прадухіліць. Локі пакараны багамі за забойства Бальдра: прыкуты да скалаў пад зямлёй [5, с. 80].

Працягваючы прадухіленне Рагнарок, скандынаўскія багі прыкоўваюць так жа да ланцугоў сына Локі і волаткі Анггрбоды – ваўка Фенрыра, і не без ахвяры: пачварны звер адкусіў руку сыну Одзіна і заступніку ваяроў – Цюру [2, с. 30]. Сын Одзіна і Ёрд – багіні зямлі – Тор некалькі разоў сутыкнуўся з другім сынам Локі і Ангрбоды – змеем Ярмугандам. Тор у адзінаборстве перамагае цмока, адправіўшы яго ўдарам свайго молата «М'ёльнір» на дно акіяну, але ня змог яго забіць. У дзень Рагнарок змей выпаўзе з-пад Сусветнага акіяну, воўк Фенрыр вырвецца з ланцугоў, і іх бацька – Локі разарве пад канец вяроўкі. Разам вырваўшыся на свабоду, павядуць за сабой войска волатаў, каб разлічыцца з скандынаўскімі багамі [4, с. 33]. Скандынаўскае дрэва свету «Ігдрасіль», якое з'яўляецца апорным стрыжнем для жыцця і існавання космасу, таксама асуджана на непазбежную пагібель. Другі змей – Нідхёг скарачае жыццё дрэву скандынаваў, кучаючы яго карані.

Марныя спробы багоў не дапусціць апакаліпсісу адлюстроўваюць, што ў рэлігіі вікінгаў усім кіруе лёс, і ніхто ня зможа змяніць наканаванага: ні людзі, ні багі. Да дня Рагнарок вярхоўны бог скандынаваў – Одзін жыве з боллю страты па смерці сына – Бальдра. Ведае ён наперад, што яму наканавана загінуць у баі з пачварным ваўком – Фенрырам, але крыху палягчае ягоныя пакуты прадказанне і прароцтва Вельвы аб тым, што скандынаўскі свет адродзіцца, і новым светам будзе кіраваць яго ўваскрослыя сыны – Бальдр і Хёд, якія вернуцца з Хель [5, с. 91].

У бітве паміж волатамі і багамі і з таго, і другога боку ёсць ахвяры: у адрозненне ад іншых рэлігіі і язычніцкіх міфалогій – у скандынаўскай багі такія ж смяротныя як людзі. Толькі некаторыя з людзей і багоў ацалеюць і перажывуць гібель сённяшняга свету.

Правадыра вікінгаў – Одзіна праглыне воўк Фенрыр разам з васьміногім канём Слейпнірам, пасля за смерць бацькі адпомсціць бог помсты – Відар, парваўшы пашчу ваўку. Тор канчаткова адолее і знішчыць змея-цмока – Ярмуганда, але коштам уласнага жыцця: грамабой загіне ад ядавітай пены пачвары. Вартаўнік багоў – Хеймдаль, што дагэтуль пратрубіў у свой рог, каб даць сігнал аб фінальнай бітве, заб'е Локі, але і таксама памрэ ад ранай, атрыманых у адзінабостве з хітрым богам агню. Аднарукі бог вайны – Цюр загіне ад велізарнага сабакі з чатырма вачыма – Гарма. Бога лета, восені і сонца заб'е волат Сурт, які спаліць у агні ўвесь свет ударам свайго вогненнага мяча. Космас, створаны дагэтуль Одзінам, Ве і Вілі, згарыць у вогненным полымі Сурта [1, с. 329].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Затым, пасля апакаліпсісу народзіцца новы скандынаўскі свет. Самаахвяраванне вышэйшых багоў Скандынавіі, што ахвяруюць сваімі жыццямі, кінуўшы выклік мацнейшым і пераўзыходзячым сілам зла і цемры, ня будуць дармовымі. Сыны і нашчадкі Одзіна (бог вясны – Бальдр, сляпы бог зімы – Хёд, багі помсты – Валі і Відар) і грамабоя Тора (Модзі – бог ваяўнічай лютасці і Магні – бог фізічнай сілы) ўспадкуюць уладу ад сваіх бацькоў над адроджаным светам скандынаваў. Радавод першабытных скандынаўскіх багоў – Буры і Бора (дзеда і бацькі Одзіна) будуць працягвацца ў новым космасе, у якім больш ня будзе месца для змагання паміж дабром і злом. Панаваць будзе толькі дабро, што адлюстроўвае падабенствы паміж новым светам скандынаваў і будучым светам у хрысціянстве пасля Страшнага Суду. Уваскрашэнне і вяртанне Бальдра з свету змрочнай валадаркі Хель падобна на ўваскрасенне сына Божага – Ісуса Хрыста. Праз Бальдра новым космасам скандынаваў кіруе вясна. І ён, як сын і спадчыннік Одзіна, будзе галоўнай крыніцай улады. Модзі і Магні, успадкуючы ад свайго бацькі Тора свяшчэнны молат – М'ёльнір, будуць кіраваць маланкамі і громам. Ацалеўшыя багі, што пазбегнулі багі, прымуць на сябе функцыі кіравання новым светам, сіламі прыроды [5, с. 92].

Рэлігія вікінгаў адлюстроўвае, што нягледзячы на "Рагнарок", яго наканаванасць і непазбежнасць, жыццё і радавод у новым свеце працягваюцца. Зыходзячы з таго, што і ў хрысціянстве, і ў скандынаўскай міфалогіі ёсць змаганне паміж сіламі дабра і зла, падобныя канцэпцыі ўяўленні ў апакаліпсісе, можна прыйсці да высновы, што скандынаўскі апакаліпсіс, падобна хрысціянскаму Суднаму Дню – не канец усяго, а пачатак, затым працяг новага жыцця пасля смерці.

## Літаратура


1. Гвин, Д. Викинги. Потомки Одина и Тора / Пер. с англ. З.Ю. Метлицкой. – М. : ЗАО Центрполиграф, 2007. – 445 с.
2. Наследники Одина. Предания скандинавских народов средневековой Европы. – СПб. : Азбука, Азбука-Аттикус, 2016. – 288 с.
3. Каханне. Смерць. Пачвары: скандынаўскія народныя балады / пер. са шведскай, дацкай, нарвежскай, фарэрскай, ісландскай, норн Яўгена Папакуля. – Мінск : Тэхналогія, 2024. – 148 с.
4. Эда. Песні пра багоў / Пер. са старажытнаісл. Яўгена Папакуля. – Мінск : Галіяфы, 2021. – 312 с.
5. Эда Сноры Стурлусана / Пер. са старажытнаісл. Яўгена Папакуля. – Мінск : Галіяфы, 2021. – 298 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова